УДК 7.031.2(476.5):75.04

# НАРОДНАЯ ІДЫЛІЯ Ў ЖЫВАПІСЕ АНТАНІНЫ МАІСЕЕВАЙ

***Вакар Л.У.***
*Установа адукацыі "Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава", Віцебск*

*Антаніна Маісеева з'яўляецца адным з найбольш яркіх сучасных інсітных творцаў Беларусі. Пераважную большасць сваіх жывапісных работ яна "падмацоўвае" літаратурнымі тэкстамі: тлумачальнымі надпісамі, вершамі, апавяданнямі, якія маюць характар наіўнага наратыву. Яе жывапіс – пераканаўчы ўзор укаранення ў прастору Віцебска і яго наваколля. Мастачка паэтызуе матывы паўсядзённасці вясковага і гарадскога жыцця, увасабляе сюжэты традыцыйнай народнай абраднасці, вулічнага відовішча, народнай смехавай культуры. У яе творчасці прысутнічаюць усе віды народнай ідыліі: землеробча-працоўная, рамесна-працоўная, любоўная, сямейная. Асноўнымі тэмамі яе жывапісу і апавяданняў з'яўляюцца гармонія існавання чалавека ў прыродзе і свеце, традыцыйнае разуменне дабра і зла, тоеснасць этычнага і эстэтычнага, панаванне дабра над злом. Панарамы гарадскога і вясковага ландшафту маюць картаграфічны характар, малюнак і колер раскрываюць экспрэсію ўнутранага пачуцця. А. Маісеева плённа распрацоўвае анімалістычныя вобразы, яе своеасаблівым аўтарскім жанрам з'яўляецца партрэт жывёлы з адметным характарам, фізіянамічнымі рысамі, жывапіснай выразнасцю. Гісторыя і культурная спадчына ў творчасці А. Маісеевай падаюцца праз пэўную фалькларызацыю і рамантыку мінулага, што фарміруе каштоўнасці сённяшняга дня.*

***Ключавыя словы:*** *наіўны жывапіс, наіўны наратыў, інсітнае мастацтва, сучасны прымітыў, экспрэсіянізм, спантаннасць творчасці, ідылічная карціна свету, паўсядзённасць, фалькларызацыя культурнай спадчыны, народная абраднасць, смехавая культура, вулічная відовішчнасць.*

*(Искусство и культура. – 2020. – № 4(40). – С. 35–39)*

# FOLK IDYLL IN ANTANINA MAISEYEVA'S PAINTING

***Vakar L.U.***
*Education Establishment "Vitebsk State P.M. Masherov University", Vitebsk*

*Antanina Maiseyeva is one of the brightest contemporary Belarusian artists. She supports most of her paintings with literary texts: interpretations, poems, stories which are of naive narration character. Her painting is a convincing example of rootedness into the space of Vitebsk and its outskirts. The artist poetizes the motives of everyday rural and urban life, depicts stores of the traditional folk rituals, street performance, public culture of laughter. All types of folk idyll, the farmer's, craftsman's, love, family are present in her creativity. The main topics of her paintings and stories are the harmony of the person's existence in the nature and the world, traditional understanding of the good and the evil, the identity of the ethnic and the aesthetic, victory of the good over the evil. Urban and rural landscape panoramas are of map character, the drawing and the color reveal the expressiveness of the inner feeling. A. Maiseyeva fruitfully develops animalistic images; an animal portrait with a distinct character, physiognomic features, artistic expressiveness is her special author's genre. History and cultural heritage in A. Maiseyeva's creativity acquire folklore character and are presented as the past which shapes values of the present.*

***Key words:*** *naive painting, naive narration, different art, contemporary primitivism, expressionism, spontaneity of creativity, idyll picture of the world, everyday life, folklore character of cultural heritage, folk rituals, culture of laughter, street performance.*

*(Art and Cultur. – 2020. – № 4(40). – P. 35–39)*

Антаніна Маісеева як самабытны аўтар са своеасаблівым светаўспрыманнем стала вядомай адразу пасля першай персанальнай выставы ў 2002 годзе і на працягу двух дзесяцігоддзяў плённа распрацоўвае абраную тэматыку. Гэта пейзажы з лірычным настроем, сюжэтна-тэматычныя карціны паўсядзённага вясковага і гарадскога жыцця, творы этнаграфічнага, гісторыка-літаратурнага зместу, а таксама вялікая колькасць вобразаў жывёл з выдатна выяўленымі індывідуальнымі характарамі і разумным,

*Адрас для карэспандэнцыі: lvakar@mail.ru – Л.У. Вакар*

Репозиторий ВГУ

амаль чалавечым позіркам. Цікавасць да яе творчасці ўзрастае з кожнай новай выставай, пра што сведчаць шматлікія рэцэнзіі мастацкіх крытыкаў [1–6]. Пра яе жывапіс з павагай піша М. Цыбульскі: "Звычайна ў палотнах А. Маісеевай звяртаюць на сябе ўвагу дынаміка пабудовы кампазіцыі, эмацыянальны ракурс тэмы. Яркія, сонечна чыстыя колеры і разам з тым згарманізаванасць палітры вылучаюць яе жывапісную манеру. Немалаважную ролю ў творах мастачкі адыгрываюць дасканала распрацаваныя дэталі, алегарычныя элементы, сімволіка колеру" [7].

Мэтай дадзенага артыкула з'яўляецца выяўленне адметнасцей ідылічнай паэтыкі і фармальна-стылёвых рыс творчасці А. Маісеевай.

**Сутнасць інсітнага мастацтва.** Творчасць А. Маісеевай развіваецца на фоне вялікай цікавасці шырокай грамадскасці да феномена інсітнага (наіўнага) мастацтва. Дадзены тып творчасці ўласцівы для самабытных мастакоў, якія не атрымалі прафесійнай адукацыі і працуюць паводле ўнутранай патрэбы [8; 9]. Яны не звязаны канонам аніякай школы і кіруюцца толькі талентам, дадзеным ім ад прыроды. У гэтага феномена ёсць шмат назваў, але самыя распаўсюджаныя "сучасны прымітыў", "наіўнае мастацтва", "інсітнае мастацтва" падкрэсліваюць яго першаснасць, шчырасць, чысціню і спантанны характар. Гэта робіць іх творы арыгінальнымі і непаўторнымі, напаўняе іх аўтэнтыкай аўтарскага сведчання. Адсутнасць ведаў выяўленчай граматы кампенсуецца шчырасцю і вынаходніцтвам. Часам іх фармальныя знаходкі потым запазычваюцца і стылізуюцца прафесійнымі творцамі, што ў гісторыі мастацтва XX–XXI стст. мае назву "прымітывізм" альбо "неапрымітывізм". Вядомы расійскі мастацтвазнаўца Г. Астроўскі падкрэсліваў, што прафесійныя творцы запазычваюць з культуры народнага прымітыву рысы ідылічнага ўспрымання свету, тоеснасць этычнага і эстэтычнага, панаванне дабра над злом, праўды над маной, а таксама традыцыі народнай абраднасці, вулічнага відовішча, народнай смехавай культуры [10]. Гэтыя прыкметы знаходзім у творах А. Маісеевай.

Сапраўдны народны жывапіс заўсёды пазнаецца праз сінтэз выяўлення і азначэння, праз шчырую эмоцыю экспрэсіі малюнка. Антаніна Маісеева малюе як дзіця – схематычна, самыя значныя дэталі павялічвае і падкрэслівае колерам. Узнікае непрапарцыянальная выява, напоўненая перажываннем, што адчувае глядач. Праз абагульнены і часам дэфармаваны малюнак, выразны жэст мастачка перадае стан героя і сваё стаўленне да яго. У карціне "Матчын хлеб" (2018) боханы хлеба і рукі маці самыя вялікія па маштабе і змешчаны ў цэнтры кампазіцыі, а маленькія і кранальныя постаці дзяцей, што застылі ў чаканні, перадаюць іх замілаванне. У "Калядках" (2002) выявы хат заснежанай вуліцы настолькі выразныя, што, здаецца, быццам домікі карагодзяць разам з дзецьмі, святкуюць Нараджэнне Хрыстова і благаслаўляюць жыццё маленькай вёскі. У невялікім творы "Стары з пеўнем" (2004) аўтар максімальна набліжае сваіх герояў да гледача і акцэнтуе ўвагу на задзірыстым характары абодвух персанажаў. Экспрэсіўную вобразнасць старога з учэпістым поглядам і пеўня з вострай дзюбай ды растапыранымі кіпцюрамі павялічвае кантраст зялёнага, чырвонага і сіняга колераў. Душэўнае і дзесьці насмешлівае стаўленне да землякоў нараджае тую асаблівую арганіку, якая пераконвае ў аўтэнтычнасці жыццёвага матэрыялу.

**Адметнасці ідылічнай паэтыкі.** Жывапіс Антаніны Маісеевай прываблівае ідылічнай паэтыкай, якая раскрывае тэму гарманічнага існавання чалавека ў прыродзе і свеце. Сядзібы сярод квітнеючых садоў, занесеныя снегам хаты, лазенкі на беразе азёр, шкадлівыя козы паблізу агародаў, прыгажуны-коні на лузе ў халодным тумане жнівеньскім ранкам, сезонныя палявыя заняткі сялян і простыя матывы жыцця гарадскіх двароў і вуліц складаюць аснову сюжэтаў яе жывапісу. На карціне "Двор бабы Мані" (2005) гаспадыня прысела на скамейку ля свайго дома і лашчыць любіміцу-казу. Праз карціны бэзу каля хаты, праз вобразы ката ў акне, чародкі куранят вакол скамейкі мастачка стварае настрой будзённасці, калі чалавеку жывецца ўтульна і проста. Яна з асаблівай любоўю фіксуе вобраз роднага асяродку, на фоне якога піша партрэт альбо іранічную сюжэтную сцэнку. На карціне "Гарманіст дзядзя Коля" (2003) мастачка з цеплынёй паказвае музыку, які грае для сябе і ката, што ляжыць на плоце.

Асаблівасць ідылічнага хранатопу апісаў М. Бахцін [11]. У якасці яго рыс ён вылучыў тры характэрныя адметнасці. Першая дэманструе векавую прымацаванасць і неадлучнасць жыцця пакаленняў да аднаго месца – роднага краю з усімі яго куткамі, роднага дому. Другая раскрываецца праз абмежаванасць рэалій ідылічнага жыцця яго асноўнымі момантамі нараджэння, кахання, шлюбу, працы, яды і піцця, смерці. Трэцяя праяўляецца праз спалучэнне жыцця чалавека з рытмамі жыцця прыроды. М. Бахцін падкрэсліваў, што для сучаснага цывілізаванага чалавека, які ў адрозненне ад старажытнай родавай свядомасці валодае індывідуальнай, дадзеныя каштоўнасці

Рэпазіторый БДУ

пазнаюцца як нанава здабытыя. Даследчык адзначаў прысутнасць ідылічных вобразаў і тэм у разнастайных сучасных жанрах, а сярод чыстых відаў ідыліі вылучаў любоўную, земляробча-працоўную, рамесна-працоўную, сямейную. Усе названыя аспекты ідылічнай карціны свету прысутнічаюць у творчасці Антаніны Маісеевай.

Яе жывапіс дае пераканаўчы ўзор укаранення ў прастору Віцебска і яго наваколля. Мастачка з вялікай любоўюаднаўляе канкрэтныя прыкметы тых мясцін, дзе разгортваецца яе жыццёвы шлях. У пейзажных карцінах Антаніны Маісеевай, як і ў творах многіх інсітных мастакоў, істотную ролю адыгрывае пачуццё ландшафту, імкненне ў карціннай прасторы перадаць яго рысы. Гэта непазбежна вядзе да вынаходніцтва картаграфічных прыёмаў і паралельнай перспектывы. Гарызонт увесь час падымаецца ўгару і ўтварае шырокую панараму, усёабдымная цэласнасць якой дазваляе ўспрыняць жыццё як сусвет. Выявы людзей, жывёл і пабудоў пры гэтым набываюць характар ідэаграмы. Асабліва запамінальнымі з'яўляюцца яе азёрныя краявіды, дзе прастора нібы шматслойны пірог фарміруецца радкамі вады і выспаў сушы ("Сустрэча на возеры", 2005; "Разводдзе", 2007). Вуліцы вёскі альбо мястэчка ўздымаюцца ў неба і па восі сусвету дакранаюцца да аблокаў, спалучаюць жыццё зямное і нябеснае ("Сястрыцы. Сяброўкі дзяцінства", 2005; "Ля магазіна. Астроўна", 2015). Цэнтрабежная кампазіцыя карціны "Вёска маёй калыскі" (2012) утворана перакрыжаваннем вузкіх сцяжынак і маленькай рачулкі, уздоўж якой размясцілася вёска і змаглі ўзнесціся да пукатай лініі небасхілу шматколерныя лапікі апрацаваных палёў. З глыбіні прасторы па сцежцы насустрач гледачу крочыць дзяўчына, што прачытваецца як выдатная метафара неабсяжнасці даляглядаў маладога жыцця і радасці яго прыняцця.

**Ідылія вясковага жыцця.** У вясковых сюжэтна-пейзажных кампазіцыях А. Маісеевай прысутнічаюць усе прыкметы працоўна-земляробчай ідыліі, дзе жыццядзейнасць чалавека абумоўлена цыкламі развіцця прыроды. У кампазіцыі "Пасадка бульбы" (2003) лірычны краявід ранняй вясны спалучаецца з эпічнай сцэнай працы сялянскай сям'і. Узгодненыя рытмы дзеянняў людзей, абшары ўзаранай зямлі ствараюць пэўную ўрачыстаць. Яе падтрымлівае вобраз белага каня, які ў народнай культуры заўсёды з'яўляецца сімвалам свята. Дагляд і ўпарадкаванне зямлі прыносіць чалавеку заспакаенне і пачуццё ўласнай годнасці. Менавіта дадзеныя вартасці ўласцівы для персанажаў і партрэтных вобразаў А. Маісеевай – "Вясновы двор. У Веры Пятроўны" (2003), "Адпачынак. Брат Анатоль" (2005). Чалавек у працы задаволены і вясёлы. Нават у драматычнай па змесце кампазіцыі "Цяжкая вясна. 1947 год. У пошуках леташняй бульбы" (2012) вобраз прыроды і праца чалавека на зямлі ўтрымліваюць надзею на лепшую будучыню. А. Маісеева раскрывае гэты настрой праз аксамітавае багацце лілова-карычневага колеру цёплай вільготнай зямлі і сумесную працу розных пакаленняў.

Для ідылічнага светаўспрымання повязь пакаленняў заўсёды выступае прыкметай парадку, пры якім светабудова захоўвае свае асновы. Класічны пастаральны сюжэт, дзе дзеці ўспрымаюць вопыт праз аповеды сталага пастуха, перадае карціна "Начлег" (2004). Рамантычная бяседа каля вогнішча і таемнасць начнога краявіду адсылаюць да шматлікіх літаратурных і жывапісных твораў XIX–XX стагоддзяў, а таксама да жыццёвага вопыту аўтара ды ўсіх, каму пашчасціла перажыць у дзяцінстве падобную прыгоду. Разам з тым пазнавальная экспрэсіўная манера жывапісу А. Маісеевай і прыгожы краявід з містычным месяцовым святлом надаюць твору незвычайную прыцягальнасць. Тэма пераемнасці пакаленняў добра падкрэслена ў апавяданні і карціне "Танец пад гармонік" (2018), дзе дзяўчынка цешыць танцамі і спевамі вясковых бабуль, дзядуль, а таксама казу, сабаку, котку і нават птушак. У канцы тэксту супольная імпрэза і перажытая ад яе радасць прыводзяць аўтара да высновы: "Жыццё працягваецца. Дай Бог, ажыве і вёска. Па-новаму, цывілізавана".

**Святочная ўрбаністычная тэматыка.** Мноства карцін А. Маісеевай прысвечана Віцебску і гараджанам, жыццё якіх выяўляецца ў разнастайных сюжэтах і ўрбаністычных дэкарацыях. Антаніна Маісеева засяроджваецца на тэмах гулянняў, урачыстасцей, адпачынку – тых момантах, якія нясуць атмасферу еднасці ўсёй супольнасці, далучанасці да сумеснай дзеі, святочнай стыхіі. Праз "Восеньскі кірмаш у Віцебску" (2005) мастачка стварае стракатую карціну народнага свята на адной са старых плошчаў. Уздоўж гандлёвых лавак сноўдаюць гараджане ў пошуках удалых пакупак, катаюцца на поні дзеці, а шчаслівыя ўладальнікі прызоў калгасных латарэяў сыходзяць з гусямі і куранятамі дадому. Аднак часцей мастачка звяртаецца да лірычных матываў, якія дазваляюць ёй перадаць вобраз жыцця і памкненні душы простага чалавека. Яскрава пра гэта сведчаць сюжэты пра жыццё гарадскіх двароў ці паркаў ("У двары старога дома", 2006; "Я люблю цябе, стары парк", 2007; "Лета.

Рэпазіторый ВДУ

Двор заквітнеў", 2018), дзе героі аддаюць перавагу сваім любімым заняткам. Часам сцэны гарманічнага існавання чалавека падкрэслена вылучаюцца з панурючай аднастайнай гарадской забудовы. На карціне "Вечаровы выгул сабак" (2005) гмахі шматпавярховых дамоў пераўтвораны ў своеасаблівую агароджу невялікай пусткі, дзе жыхары шпацыруюць са сваімі гадаванцамі і разам дэманструюць карціну ідыліі жыцця чалавека ў непарыўнай еднасці з прыродай.

**Анімалістычныя вобразы.** Пэўна, самымі любімымі персанажамі А. Маісеевай з'яўляюцца жывёлы, хатнія і лясныя, – усе, хто патрабуе апекі чалавека, і адначасова праз гэтае выяўленне аўтар раскрывае саму чалавечнасць у асобе, прыхаваную дзесьці патрэбу ў душэўнай ласцы. Цёплыя адносіны да ўсялякай жывой душы, а таксама выдатнае веданне нораваў жывёл дазволілі ўвасобіць у жывапісе своеасаблівы "Ноеў каўчэг". Мастачка стварыла вялікую галерэю вобразаў усіх сваіх чатырохногіх і крылатых сяброў: сабак, коз, коней, кароў, пеўнікаў, куранят, варон, снегіроў ды іншай жыўнасці. Для яе жывапісу ўласціва разнастайнасць жанраў у выяўленні жывёл і птушак. Гэта ўлюбёнцы гаспадароў – сабакі і коткі ў інтэр'еры, вясковым альбо гарадскім краявідзе; цэлыя сямействы, статкі, зграі ў натуральным прыродным асяродку; экзатычныя жывёлы паўднёвых краін. Своеасаблівым аўтарскім жанрам з'яўляецца партрэт з усімі яго характарыстыкамі: родавым падабенствам, фізіянамічнай адметнасцю, псіхалагічным станам, жывапіснай выразнасцю: "Ганарлівы профіль казы Лізы" (2001), "Даберман Вельма" (2003), "Сабака Бакс" (2004), "Казёл Шурка" (2011), "Орлік" (2016), "Любаша" (2016) ды іншыя. Чыста жаночая лірыка, уласцівая для яе пейзажаў, у партрэтах "братоў меншых" абарочваецца ў іх незвярынаю сардэчнасць. Шэдэўрамі анімалістычнага жывапісу А. Маісеевай з'яўляюцца сюжэтныя кампазіцыі з жыцця жывёл, дзе мастачка з вялікім талентам раскрыла выразную пластыку, колеравае і фактурнае багацце пёраў, поўсці і характары сваіх улюбёнцаў: "Сапернікі" (2013), "Перад навальніцай" (2013), "На выпас з шэрым казлом наперадзе" (2013), "Па раннім снезе" (2013), "Гусі каля вадаёма" (2013), "Вясёлая сямейка" (2016).

**Ідылія фальклорна-этнаграфічных сюжэтаў.** Асобную групу твораў склалі карціны па фальклорна-этнаграфічнай тэматыцы. Гэта побыт і традыцыйныя святы беларускай вёскі, якія звязаны са старажытнымі земляробчымі культамі, падпарадкаваны сезоннаму прынцыпу і таму з'яўляюцца квінтэсэнцыяй народнай ідыліі. У раннім творы "Купалле" (2001), прысвечаным летняму сонцастаянню, мастачка паказвае закаханых, якія імкнуцца знайсці папараць-кветку – кветку шчасця. Яна змагла перадаць таямнічасць купальскай ночы, прыгажосць народнага міфа. Ідылічнае светаўспрыманне вучыць жыць неабходным і першарадным, што выдатным чынам перададзена ў аповедзе і карціне "Лапцікі" (2018). Кананічны для народнага жывапісу сюжэт "Дзед лапці пляце, а баба кудзелю прадзе" ўвасоблены праз дзіцячую гісторыю набыцця першага абутку і адпаведна таму атрымлівае новыя эмацыянальныя акцэнты, аднак захоўвае сентыментальны характар патрыярхальнасці. Карціна "Гулянне на Івана Купала" (2017) з'яўляецца прыкладам аўтарскай інтэрпрэтацыі святочнай традыцыі, перанесенай з вёскі ў горад. У дадзеным выпадку мы сустракаемся з ідыліяй-марай А. Маісеевай пераадолець разарванасць сучаснай культуры і традыцый, чалавека і прыроды. Добрай ілюстрацыяй гэтага выступае карціна "Масленіца" (2012), дзе мастачка паказала праводзіны зімы ў прыродным асяроддзі гарадскога парку адпаведна з народнай традыцыяй.

**Фальклярызацыя культурнай спадчыны.** Гісторыя і культурная спадчына ў творчасці А. Маісеевай падаюцца праз пэўную фальклярызацыю і рамантыку мінулага, што фарміруе каштоўнасці сённяшняга дня. Для яе глыбокім сакральным сэнсам напоўнены вобразы і біяграфіі знакамітых творцаў, і найперш Марка Шагала. Улюбёны Шагалам матыў палёту становіцца асновай для яе смелых інтэрпрэтацый і творчага дыялогу з Майстрам. Адчуванне цуду прысутнічае ў карціне "Вяртанне Марка Шагала" (2003), дзе гарадскі люд вітае дух вялікага Майстра, што ляціць над горадам на воблаку-Пегасе. Ён пакідае Парыж, Нью-Ёрк, Маскву і іншыя сталіцы свету ды імкнецца да роднага дому. На карціне "Сустрэча Бэлы і Марка" (2012) аўтарка намалявала закаханых на фоне віцебскай панарамы двойчы: паводле ўспамінаў Бэлы праілюстравала іх сустрэчу на мосце праз Дзвіну, а паводле карцін Шагала ўвасобіла іх палёт над Віцебскам. Рэальнае і фантазійнае супала ў часе і прасторы. Знакамітая мастачка Алена Кіш прадстае ў карціне А. Маісеевай не праз аповед яе трагічнага лёсу, а падчас напісання дывана "Дзева на водах", які супраць логікі кампазіцыі "перагорнуты" на гледача. Падаецца гэтая сцэна вельмі ідылічна: мастачка сядзіць на фоне абраза з белым

Рэпазіторый ВДУ

ручніком, зімовага краявіду ў акне з белымі фіранкамі, вышытымі ружамі. Па сценах хаты дываны развешаны нібы ў выставачнай зале, і побач котка ціха назірае за чарадзействам творцы. Своеасаблівай ідыліяй-марай з'яўляецца карціна "Сумоўе паэтаў" (2008), дзе А. Маісеева ўвасобіла фантазійную сцэну бяседы А. Пушкіна і Г. Ахматавай, што прачытваецца як пераемнасць паэтычнай традыцыі.

Для народнай графічнай і жывапіснай карцінкі гісторыка-культурнага зместу ўласцівы жанр манументальнага партрэта, дзе герой прадстае ў поўны рост на першым плане ў атачэнні дадатковых сюжэтаў, меншых па маштабе. Дадзеную кампазіцыйную схему выкарыстоўвае А. Маісеева дзеля стварэння вобразаў любімых мастакоў і пісьменнікаў. На палатне "Марк Шагал. Мары юнацтва" (2016) мастак размешчаны па цэнтры з палітрай у руках, а па баках чатыры сюжэтныя сцэны распавядаюць пра яго дзіцячыя захапленні рознымі прафесіямі: паэта, скрыпача, танцора, кантара. Кампазіцыя "Свет Уладзіміра Караткевіча" (2018) спалучае вобраз пісьменніка, які задумення сядзіць на беразе Дняпра, і знакавыя вобразы яго гістарычных твораў. На карціне "Васіль Быкаў. Успаміны аб вайне" (2018) пісьменнік стаіць каля бярозы, а праз усю прастору ўздымаецца дарога да вясковай хаты, дзе чакае сына маці. Уздоўж дарогі напісаны сюжэты з яго ваенных аповесцей і раскіданы лісты з цытатамі. Усе кампазіцыі маюць складаны мантажна-аплікатыўны характар, што дазваляе аўтару пашырыць межы партрэтнага жанру, напоўніць яго сюжэтнымі лініямі, увасобіць мегавобраз творчасці абранага куміра. Поліфанія сюжэтаў у адной карціннай прасторы, а таксама спалучэнне выяў і тэкстаў характэрныя для народнай культуры. Дадзеныя рысы сведчаць пра аўтарскую самастойнасць і творчую волю.

Многія народныя творцы ўводзяць у кампазіцыі альбо суправаджаюць свае жывапісныя творы тэкстамі, якія тлумачаць змест твора альбо дапаўняюць яго дадатковым сэнсам. А. Маісеева піша кароткія анатацыі, вершы ці змястоўныя апавяданні, якія маюць аўтабіяграфічны характар і напоўнены глыбокім лірызмам [12]. У іх аўтар раскрывае ўласныя перажыванні, пачуцці, дзеліцца надзеямі. Яны маюць спавядальны характар, дзе мастачка піша пра сваю заклапочанасць аб разарванасці жыцця вёскі і горада, аб страце беражлівых адносін чалавека да прыроды, жывёл, аб неабходнасці берагчы ўнутраны свет.

**Заключэнне.** У карцінах і ўспамінах А. Маісеевай увасоблены жыццёвы вопыт і каштоўнасці пакалення, якое вырасла ў вёсцы, зведала цяжкасці пераадолення пасляваеннага разбурэння; пакалення, якое пераехала ў горад, але захавала сваю прывязанасць да зямлі і прыроды, разуменне неабходнасці душэўных і духоўных намаганняў дзеля гармоніі ва ўласным доме і ва ўсім свеце. Паводле Міхася Стральцова гэтае пакаленне ўвайшло ў літаратуру праз метафару "сена на асфальце". Ідылічныя карціны і наіўныя наратыў А. Маісеевай даюць разнастайныя ўзоры гэтага вызначэння. Творчасць А. Маісеевай дэманструе яркі жывапісны талент, мае глыбокія народныя карані і з'яўляецца крыніцай народнай этыкі.

**ЛІТАРАТУРА**


1. Будкевич, М. Краски жизни в «наивном искусстве» / М. Будкевич // Віцьбічы. – 2010. – 6 февр.
2. Бычковская, О. Приношение мастеру / О. Бычковская // Витебский проспект. – 2007. – 19 июля.
3. Вакар, Л. Разам з Шагалам да нябёсаў / Л. Вакар // Мастацтва. – 2012. – № 8. – С. 30–34.
4. Вакар, Л.У. Мастацтва insita: з гісторыі правядзення выставак непрафесійнага мастацтва / Л.У. Вакар [і інш.]. – Мінск: СтройМедиаПроект, 2013. – С. 92, 96, 132, 149, 225.
5. Василевич, К. Жить с любовью / К. Василевич // Віцьбічы. – 2017. – 28 лістап.
6. Трапезникова, Л. Яркая палитра жизни / Л. Трапезникова // Беларускі час. – 2007. – 16 крас. – С. 2, 17.
7. Цыбульскі, М. І творчасць, і споведзь, і малітва / М. Цыбульскі // Витебский проспект. – 2007. – 20 дек. – С. 3.
8. Вакар, Л.У. Наіўнае (інсітнае) мастацтва Беларусі / Л.У. Вакар // Весці Нац. акад. навук Беларусі. Сер. гуманітар. навук. – 2014. – № 4. – С. 80–85.
9. Лабачэўская, В.А. Інсітнае мастацтва / В.А. Лабачэўская // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. Т. 7: Застаўка – Кантата / рэдкал.: Г.П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск: БелЭн, 1998. – С. 262–264.
10. Островский, Г.С. Лубочность – категория народного искусства / Г.С. Островский // Декоративное искусство СССР. – 1983. – № 11. – С. 15–17.
11. Бахтин, М.М. Формы времени и хронотопа в романе. Очерки по исторической поэтике / М.М. Бахтин // Вопросы литературы и эстетики: исследования разных лет / М.М. Бахтин. – М.: Худож. лит., 1975. – С. 374–375.
12. Моисеева, А.М. Годы накопили … много картинок / А.М. Моисеева // Мастацтва прымітыву і яго формы ў сучаснай культуры: матэрыялы навук.-практ. канф., Віцебск, 4–5 мая 2012 г. / ДУ "Віцебскі АМЦНТ"; рэд. Л.У. Вакар [і інш.]. – Мінск, 2013. – С. 124–128.


*Паступіў у рэдакцыю 08.09.2020*

Рэпазіторый ВДУ